**Каляда В.Р.**,*выкладчык*

# МАГЧЫМАСЦІ САЦЫЯДРАМЫ Ў РАЗВІЦЦІ АСОБЫ

Сучасная тэхнакратычная цывілізацыя моцна змяніла свае патрабаванні да чалавека. Абсалютызуецца роля тэхнікі ў сацыяльным жыцці і падкрэсліваецца залежнасць асобы ад тэхналогіі.

Сацыяльна-эканамічныя змяненні прыводзяць да змяненняў маральных. Чалавек не паспявае за развіццём тэхнічных навук, якія ўсё менш і менш удзяляюць увагі этыцы ўзаемаадносін. У сувязі з іерархіяй прафесій, сацыяльным становішчам, выхаваннем узнікаюць праблемы зносін паміж людзьмі. Ідзе актыўны пошук шляхоў і метадаў вырашэння праблем канфліктнасці, стрэсу. У сённяшнім дынамічным жыцці чалавеку вельмі цяжка самастойна выйсці з канфлікту з іншымі людзьмі, з самім сабою, таму ён усё часцей звяртаецца да дапамогі прадстаўнікоў сацыяльных службаў: псіхолага, псіхатэрапеўта. Але вышэйназваныя службы працуюць па пераадольванню канфлікту ўнутры асобы. Чалавек не можа існаваць па-за грамадствам, таму паралельна з тэрмінам «псіхадрама» з'яўляецца тэрмін «сацыяд-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рама», аснову якога вызначае мадэліраванне ўзаемаадносін паміж людзьмі для дасягнення ўзаемаразумення.

У чалавека падсвядома заўсёды было імкненне да гульні. Вось гэта імкненне і выкарыстоўвае для пераадольвання канфліктаў сацыядрама, якая ўяўляе сабою «від групавой псіхатэрапіі», дзе «ўдзельнікі мадэліруюць жыццёвыя сітуацыі, выступаюць пачаргова ў якасці акцёраў і гледачоў з тым, каб усвядоміць асабісты сэнс гэтых сітуацый і канфліктаў». Сацыядрама шукае спосабы наладжвання эмацыянальных узаемаадносін, дапамагае выпрацоўваць эфектыўныя стэрэатыпы паводзін, якія адаптуюць да канкрэтных умоў, блакіруе тэндэнцыю стэрэатыпна адказваць на ўздзеянне акружаючых, што становіцца адбіваецца на агульным развіцці чалавека. Разыгрываючы «ролю» ў сацыядраме, «артыст» ідзе «ад сітуацыі да індывіда», што дае магчымасць разглядаць чалавека ў тыповай сітуацыі, якая вызначае спосаб дзеянняў паводзін, адпаведна ўмовам жыцця (сітуацыі). Такім чынам, адаптацыйнай асноўнай задачай вышэйназванага метаду пераадольвання канфлікту ўнутры малой групы з'яўляецца рэгуляцыя ўзроўню паводзін асобы ў розных соцыумах.

Наша культура разглядае чалавека як самастойнага суб'екта дзеяння, падкрэсліваючы цэльнасць «Я» ва ўсіх яго праяўленнях. Гэта падразумявае аддзяленне чалавека ад акружэння, яго нейкую ізаляванасць, што выклікае супрацьпастаўленне «Я» адной асобы «Я» другой. У гэтым выпадку сацыядрама можа дапамагчы знайсці момант тоеснасці паміж рознымі людзьмі, што амаль раўназначна згодзе. Аднак мы не ідэалізуем ролю сацыядрамы ў развіцці камунікатыўных якасцей, псіхалагічнай адаптацыі чалавека ў грамадстве.

Каб пазбегнуць хаатычнасці ў працы сацыяльнага педагога па сацыядраме, неабходна стварыць праграму падрыхтоўкі рэжысёраў сацыядрамы, альбо эксперыментатараў, якія б валодалі навыкамі сацыяльнай псіхалогіі, мелі акцёрскія здольнасці, маглі дыягнаставаць унутрыгрупавыя канфлікты.

Новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы змянілі каштоўнасную арыентацыю асобы, што выклікала ў грамадстве

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэнтрацыю на «Я», а не на «Мы». Сацыядрама ў большай меры ахоплівае грамадскія каштоўнасныя арыентацыі, чым асабістыя, сацыялізуе, акультурвае схільнасці, садзейнічае «ўрастанню» асобы ў эмоцыі, выпрацоўвае тактыку і тэхніку зносін паміж асобамі ў малых групах. Яна дапамагае чалавеку паглядзець на сябе з боку, стаць на аб'ектыўную пазіцыю; у той жа час яна не абмяжоўвае свабоду выбару, дапамагае індывідуальнасці вярнуцца да самой сябе, адчуць грамадскую ўзаемасувязь.

Прыводзячы асобу да бесканфліктнасці, сацыядрама аказваецца свайго роду гарманізатарам індывідуальнасці. У выніку сказаннага сацыядрама разглядае ўзаемаадносіны чалавека і групы ў такім своеасаблівым спектаклі, дзе гледачам задаецца пэўная роля, якая навязвае ім асабістае ўспрыманне. Пры гэтым чым менш рэгламентаваная роля, тым больш магчымасцей даецца для самарэалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР